# КОЛА ГОДА Ў НАРОДНАЙ ТРАДЫЦЫІ

## КАЛЯДЫ.
## (Паказ калядных звычаяў 1. У сцэнічным варыянце 2. У вёсцы ці горадзе.)

1. **Дзеючыя асобы (калядны гурт):** звяздар, завітальнік, каза, механоша, цыган, цыганка, лекар,  хлопцы і дзяўчаты.

Гурт выходзіць і размяшчаецца на сцэне з песняй: „Учора з вячора”.

**Завітальнік.** ( Выходзячы наперад). Добры вечар у хату! Добры вечар гаспадарам! Дазвольце маёй кампаніі разам з казлом павіншаваць вас са святам, развесяліць усю грамаду?!

Прывітальная  танец-песня „Шчодры вечар”, аркестр

**Механоша.** Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!Сардэчна вітаем і ўсіх паздраўляем з Ражством Хрыстовым і зваротам сонейка да лета!

„На новае лета…” -  паўтор  a kapella  апошняга куплета прывітальнай

**Цыган.** Я – цыган багаты! У мяне ў адным  кармане вош на аркане, а ў другім блыха на цапе!

**Цыганка.** Я – цыганка маладая, я цыганка непрастая – умею варажыць! Пакажы, барын, ручку, палажы грошай кучку – усю праўду скажу, усю ісціную!

Варожыць, збірае грошы, танцуе, да яе далучаецца цыган.

**Цыган.** Пацалуемся  з  табой, белая мая, як галавешачка! (Цалуюцца ) Каму гадка, а нам з табою сладка!

**Цыганка.** Сенька, досыць табе мяне цалаваць, трэба лепей паскакаць!

**Цыган.** Музыкі! Мазурку нам сыграйце!

Удзельнікі выконваюць танец „Мазурка” (або іншы), затым песню „Каліна-маліна”(або іншую),аркестр.

**Дзяўчына.** Ой, Лявоніха, Лявоніха мая – да чаго ж ты давяла! Маць апошнюю кароўку на бацінкі прадала!

Выконваецца танец „Лявоніха”(або іншы), аркестр

**Завітальнік і механоша.** ( Разам ). Жадаем, пане-гаспадару – на полі капамі, на гумне – тарпамі, у таку – умалотам, у арудзе – спорам, у млыне – з прымолам, у дзяжы – з падыходам, у печы – з прыбыткам.

**Увесь гурт.** З добрым ужыткам!

„Го-го-го, каза, го-го-го, шэрая” - карагод-песня, выконваюць усе ўдзельнікі, аркестр.

Каза танчыць і раптам падае на падлогу. Усе яе абступаюць.

**Механоша.** Каза шуткі прытварыла: абмахнулася, упала. Людзі добрыя, а ці ёсць тут сярод вас урач-лекар казу вылечыць? Ці змяя яе ўкусіла, ці чэмер прыстаў? Лекара! Усе: Лекара!

**Лекар.** Я лекар! Галоўны аптэкар – кароў лячу, корпію ўстаўляю, людзей на той свет адпраўляю! (Аглядае казу.) І што ж каза-хворая жадае, каб яна ўстала?

**Каза.** Павесяліце мяне, можа і палепшае!

Удзельнікі выконваюць танец „Прасцяк”(або іншы), аркестр.

**Каза.** Няхай хто песню заспявае, то можа мне і палягчае!

Выконваецца песня, аркестр.

**Каза.** А пакажыце яшчэ, як у вас пад Менскам скачуць на вечарынах!

Выконваецца танцавальная кампазіцыя „Менскі вячор”(танцы свайго рэгіёна), аркестр. Каза ўстае, танцуе разам з усімі, але пасля таго, як танец заканчваецца, зноў падае на падлогу, ляжыць і не ўстае.

**Цыган.** Ой, што ж з табой, наша казюленька? Каза ўпала, здохла, ператанцавала! Нясі, гаспадар, сала, каб наша козачка ўстала!

**Лекар.** Гаспадар! Бліны на стол стаў, каб наш казёл устаў!

Усе ўдзельнікі выпрошваюць каляду, кажучы па чарзе:

- давай, баба, каўбасу, а то хату растрасу
- пахадзі каля печкі, пашукай нам перапечкі
- залезь, дзядзька, на драбінку ды адрэж нам саланінкі
- хадзі, цётка, каля кваскі, пашукай жа нам каўбаскі
- дай нам сала, не скупіся – каб ячмень твой урадзіўся!

**Атрымаўшы каляду:**

**Завітальнік.** Дабранач, гаспадару з гаспадыняю, дабранач! А не той, што нанач, а той, што на ўвесь век!

Усе па чарзе кажуць зычанні, абсыпаючы гаспадароў зернем:

- Святкуем калядкі – лавіце зярняткі! Лавіце рукой, каб добры быў настрой!
- Каб моцна грэла сонца – кіну ў аконца!
- Майце ўсяго даволі, а бяды – ніколі!
- Нікога не хвалюйце – усім цяпло даруйце!
- Здаровы бывайце – нас не забывайце ( разам )

Удзельнікі выконваюць развітальную песню “Будзь,Ваша, здароў, як рыжык бароў”(або іншую) ,аркестр. З развітальнай песняй гурт адыходзіць.

**2.**

**Дзеючыя асобы ( калядны гурт ):**

Звяздар, завітальнік, каза, механоша, цыган, цыганка, хлопцы, дзяўчаты, гарманіст.

Калядны гурт падыходзіць да парога хаты або кватэры, іграе музыка, завітальнік выходзіць наперад.

**Завітальнік.** Добры вечар у хату! Добры вечар добрым людзям! Ці дазволіце маёй кампаніі разам з казлом павіншаваць вас са святам, развесяліць усю грамаду?

Пасля атрымання дазволу ўсе ўваходзяць і спяваюць прывітальную „Добры вечар вам, шчодры вечар”

**Механоша.** Добры вечар таму, хто ў гэтым даму! Сардэчна ўсіх вітаем і паздраўляем з Ражством Хрыстовым, Новым годам і зваротам сонейка на лета.

Удзельнікі выконваюць песню „На новае лета”(або іншую)

**Цыган.** (Выходзячы наперад). Я цыган багаты – у мяне ў адным кармане вош на аркане, а ў другім – блыха на цапе!

**Цыганка.** Я цыганка маладая, я цыганка непрастая – умею варажыць! (Падыходзіць да гаспадара хаты.) Пакажы, барын, ручку! Палажы грошай кучку – усю праўду скажу, усю ісцінную! (Варожыць. Танцуе, да яе далучаецца цыган).

**Цыган.** Гэй, музыкі, „цыганачку” нам сыграйце.Танцуюць разам.

**Завітальнік з механошам.** Жадаем, пане гаспадару, на полі – капамі, на гумне – тарпамі, у таку – умалотам, у арудзе – спорам, у млыне – з прымолам, у дзяжы – з падыходам, у печы – з прыбыткам!

**Увесь гурт.** З добрым ужыткам!

Карагод „Го-го-го, каза,го-го-го, шэра” Каза падае на падлогу.

**Механоша.** Каза шуткі прытварыла – абмахнулася, упала! Людзі добрыя, ці ёсць сярод вас лекар, каб казу вылечыць? Ці змяя яе ўкусіла, ці чэмер прыстаў?

**Усе.** Лекара, лекара!

**Лекар.** Я - лекар! Галоўны аптэкар: кароў лячу, корпію ўстаўляю, людзей на той свет адпраўляю. (Аглядае казу.) А штоб каза-хворая пажадала, каб яна ўстала?

**Каза.** Мэ –э-э-э! (Ляжыць.)

**Лекар.** Гаспадар, бліны на стол стаў, каб наш казёл устаў!

Выпрошванне каляды (па чарзе):

- давай, баба, каўбасу, а то хату растрасу
- пахадзі каля печкі, пашукай нам перапечкі
- хадзі, цётка, каля кваскі – пашукай жа нам каўбаскі

- залезь,дзядзька, на драбінку ды адрэж нам саланінкі
- дай нам сала, не скупіся, каб ячмень твой урадзіўся!

**Атрымаўшы каляду:**

**Завітальнік.** Дабранач, гаспадар з гаспадыняй, дабранач! А не той, што нанач, а той, што на ўвесь век!

Зычанні (па чарзе):

- святкуем калядкі – лавіце зярняткі
- лавіце рукой, каб добры быў настрой
- каб моцна грэла сонца – кіну ў аконца
- майце ўсяго даволі, а бяды – ніколі
- нікога не хвалюйце – усім цяпло даруйце
- здаровы бывайце – нас не забывайце!

Гурт з песняй адыходзіць (развітальная песня “Ішла каляда” або “Будзь,Ваша, здароў”або іншая)

**Сцэнарый склалі намеснік дырэктара Сеніцкай школы Мінскага раёна Бярнарда Іванова і настаўніца Тамара Жураўлёва.**